УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”
Факультэт дадатковай адукацыі

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Першы прарэктар БДУКМ
______________________Ю.П.Бондар
“____” _________________2012 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ВУЧЭБНАЯ ПРАГРАМА ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ

# Сцэнаграфія свят і відовішчаў

спецыяльнасці перападрыхтоўкі
1-17 01 71 Рэжысура свят і відовішчаў
кваліфікацыя: рэжысёр свят і відовішчаў
у адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам перападрыхтоўкі,
зацверджаным 03.11.2010 г. № 25-17/197

Мінск 2012

Распрацоўшчык праграмы: Барвенава Ганна Аляксандраўна, дацэнт кафедры рэжысуры абрадаў і святаў УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, кандыдат мастацтвазнаўства

Рэкамендавана да зацвярджэння:

Саветам факультэта дадатковай адукацыі УА "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў"
Пратакол пасяджэння ад ______________ № ______

Навукова-метадычным саветам УА "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў"
Пратакол пасяджэння ад ______________ № ______

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# УВОДЗІНЫ

“Сцэнаграфія відовішчаў і свят" — адна із спецыяльных дысцыплін у курсе падрыхтоўкі спецыялістаў для галіны культуры. Без мэтанакіраванага і асэнсаванага выкарыстання архітэктурнага і прыроднага ландшафту, дэкаратыўных сродкаў, колеру, святла, сцэнічнага касцюма, рэквізіту і іншага немагчыма стварыць паўнавартаснае сцэнічнае дзеянне.

Аб’яднаць разрозненае, стварыць цэласнае відовішча – мэта сцэнаграфіі.

**Мэта курса** "Сцэнаграфія відовішчаў і свят" – на аснове ведаў па матэрыяльнай культуры Беларусі навучыца будаваць канцэптуальныя палажэнні будучых рэжысёрскіх прац, высокапрафесійна ўвасабляць яе здабыткі ў сучаснай святочнай культуры; спасцігнуць прынцыпы арганізацыі прасторы мастацка-дэкаратыўнымі сродкамі, авалодаць асноўнымі мастацкімі і практычнымі пытаннямі пастановачнага комплексу свята.

**Задачы курса**:

- Закласці асновы тэарэтычных ведаў аб напрамках, праблемах сцэнаграфіі, этапах яе развіцця;
- Пазнаёміць студэнтаў з гісторыяй сцэнаграфіі існуючыя ва ўзаемадзеянні з рэжысурай;
- Развіваць уменне аналізу эскізаў дэкарацыйнае рашэнняў, арыентавацца ў свеце, у галіне сцэнаграфіі, валодаць неабходным аб'ёмам спецыяльнай тэрміналогіі.

**Ведаць:** асновы тэарэтычных ведаў аб напрамках, стылях сцэнаграфіі.

**Умець:** аналізаваць эскізы дэкарацыйнае рашэнняў мастацка-культурных знакаў, напрамкаў у сферы мастацкай культуры краін і народаў свету;

выпучаць тыпалагічныя адрозненні лакальных варыянтаў развіцця мастацкай культуры розных рэгіёнаў;

суадносіць светапогляд эпохі з пэўным мастацкім стылем, напрамкам, творчай манерай канкрэтнага мастака, спецыфікай тэхнікі;

валодаць: неабходным аб'ёмам спецыяльнай тэрміналогіі.

Дадзеная дысцыпліна спрыяе фарміраванню наступных **кампетэнцый**:

- Разумець сутнасць і сацыяльную значнасць сваёй будучай прафесіі, асноўныя праблемы дысцыплін, якія вызначаюць канкрэтную вобласць дзейнасці, бачыць іх ўзаемасувязь ў сістэме ведаў (ОК-8);
- Быць гатовым да супрацоўніцтва з калегамі ў прафесійнай супольнасці, ведаць метады кіравання, умець арганізаваць працу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Усяго на вывучэнне дысцыпліны адведзена 58 гадзін, з іх 32 гадзіны аўдыторных (16 - лекцыі, 16 - практычныя), 26 гадзін - самастойная работа.

Форма выніковага кантролю – экзамен.

**Тэматычны план**

| Назва тэм | Колькасць гадзін | | | |
|---|---|---|---|---|
| | Лекцыі | Практ.з. | СРС | Усяго |
| 1. Матэрыяльная культура Беларусі ў кантэксце сучаснага свята | 2 | 2 | 4 | 8 |
| 2. Сімволіка і яе месца ў сцэнаграфіі свята | 2 | 2 | 4 | 8 |
| 3. Сцэнаграфія свята на адкрытай прасторы | 4 | 4 | 6 | 14 |
| 4. Сцэнаграфія свята ў закрытым памяшканні | 4 | 4 | 6 | 14 |
| 5. Праца мастака-пастаноўшчыка над комплекснай сцэнаграфіяй свята | 4 | 4 | 6 | 14 |
| **Усяго** | **16** | **16** | **26** | **58** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

**Тэма 1. Матэрыяльная культура Беларусі ў кантэксце сучаснага свята.**

*Архітэктура Беларусі.* Культавыя помнікі, замак-палац, горад, мястэчка, вёска (узнікненне, маркіроўка, сацыяльная прыналежнасць і інш.).

Культавае дойлідства, знакавасць, сімволіка, стылістыка. Старадаўнія паганскія сакральныя (культавыя) святыні Беларусі: горы, узгоркі, курганы, пячоры, могілкі; святыя камяні (следавікі, камяні-караўцы, камяні-шаўцы і інш.); каменныя і драўляныя (абракальныя і прыдарожныя) крыжы; святыя крыніцы, калодзежы; рэкі, вытокі рэк, азёры, балоты; святыя дрэвы, гаі, дарогі, лашчыны, іх назвы, легенды і паданні пра іх. Паходжанне назваў гарадоў, вёсак і г.д., легенды і паданні.

Старадаўнія прозішчы і імёны. Асноўныя стылі, уласцівыя культаваму мастацтву Беларусі. Мецэнацтва. Іеарахічнасць і супадпарадкаванасць.

**Тэма 2. Сімволіка і яе месца ў сцэнаграфіі свята**

*Вызначэнне паняццяў "сімвал", "сімволіка".* Месца сімволікі ў вобразным мастацка-дэкаратыўным вырашэнні свята. Паняцце "сімволіка свята".
Паняцце дзяржаўная, нацыянальная, народная сімволіка. Паняцце "геральдыка". Асноўныя правілы геральдыкі. Паняцце "герб". Герольд, або гербавы кароль. Функцыі (рэпрэзентатыўная, распазнавальная) і прызначэнне герба (атрыбут працэсій, свят, фэстаў, хаўтур; пячаткі, харугвы, будынкі, надмагіллі, зброя, кніжныя выданні і інш.). Паняцці "поле", "выява", "легенда". Дзяленне тарка і парадак чытання гербаў. Геральдычныя колеры. Колеры дзяржаўнай сімволікі. Нацыянальныя сімволіка колераў. Ідэйны і іканаграфічны генезіс герба ВКЛ "Пагоня". Гісторыя ўзнікнення і сімволіка харугваў, сцягоў. Кампазіцыя, каларыстыка, сімволіка герба і сцяга Беларусі. Судачыненні колераў герба і сцяга. Гімн. Паняцце "пячатка", варыянты і функцыі пячатак. Выкарыстанне дзяржаўнай сімволікі ў святочнай культуры.

**Тэма 3. Сцэнаграфія свята на адкрытай прасторы**

*Месца свята.* Мастацка-дэкаратыўнае вырашэнне свята пачынаецца з выбару месца яго правядзення свята або з ацэнкі прыродных ці архітэктурна-мастацкіх вартасцяў прапанаванага месца. Крытэрыі ацэнкі. Культурныя і гістарычныя вартасці месца правядзення свята. Месца традыцыйнага правядзення свята. Выкарыстанне ракі, возера, вуліцы, перакрыжавання вуліц, поля, гары, крыніцы і інш.; паданні, звязаныя з гэтымі месцамі, тлумачэнне ў святочнай дзеі правядзення рытуальных дзеянняў менавіта ў гэтым месцы. Магчымыя месцы правядзення свята на гістарычную ці другую тэматыку (гарадзішча, замак, палац, ратуша, дом губернатара, плошча, гандлёвыя шэрагі і інш.). Выкарыстанне ў святочнай дзеі звестак пра гістарычных асоб і падзей, звязаныя з гэтым месцам, прывелеі і інш. Пошук месца, якое найбольш адлюстроўвае тэматыку пазаабрадавага свята. Дакладна вызначаная тэрыторыя свята і яе

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пазначэнне. Зручнасць месца для ўдзельнікаў і гледачоў: сцэнічныя пляцоўкі, глядацкія рады, службы, шляхі, размяшчэнне удзельнікаў і г.д.

## Тэма 4. Сцэнаграфія свята ў закрытым памяшканні

*Арганізацыя перад-, святочнай і постсвяточнай атмасферы свята мастацка-дэкаратыўнымі сродкамі.* Выкарыстанне неабходных і магчымых сцэнічных пляцовак – прасторы вулічнай плошчы, хола, памяшканняў у комплексным мастацка-дэкаратыўным вырашэнні свята. Завязка, кульмінацыя, развязка як неабходныя элементы сцэнічнай і мастацкай пабудовы. Жанравасць. Дынамічнасць, вастрыня сюжэта, таямніца, напружанне дзеяння, выключнасць герояў, кантраст і інш. Сцэнічная ўмоўнаць.

*Наладжанне сцэны і закуліснай прасторы.* Асноўныя часткі сцэны-скрыні: планшэт і сцэнічная гульнёвая прастора, верхняя сцэна, ніжняя сцэна (трум), авансцэна, сцэнічныя кішэні, ар'ерсцэна, аркестравая яма, дапаможныя памяшканні сцэны (кішэні), галаснікі.

Тэхнічнае аснашчэнне сцэны.

## Тэма 5. Праца мастака-пастаноўшчыка над комплекснай сцэнаграфіяй свята

Творчая група сцэнаграфіі свята і галоўныя прынцыпы яе работы.

*Аргкамітэт свята, яго склад і задачы структурных падраздзяленняў.* Творчая садружнасць рэжысёра і мастака. Сінтэз сцэнаграфіі і рэжысуры. Творчая група сцэнаграфіі свята, склад, функцыянальныя абавязкі ўдзельнікаў і галоўныя прынцыпы працы.

*Паслядоўнасць і асноўныя этапы сцэнаграфічнага вырашэння свята.*

Складанне праекта комплекснай сцэнаграфіі свята.

*Тэма, мэта, задачы* свята.

*Месца і час* свята.

*Генеральны план* тэрыторыі свята і памежных тэрыторый.

*Макет* (аксанаметрыя, перспектыва) тэрыторыі і галоўных пляцовак свята. Эскіз і макет – рознасць іх функцый. Некаторыя прыёмы выканання эскізаў: камп'ютэрная графіка, жывапіс, графіка, аэраграфія, камбінаваная тэхніка. Макет як сродак прасторавага праектавання мастацка-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дэкаратыўнага вырашэння свята. Тры стадыі распрацоўкі макета-выгарадкі: планіроўка, чарнавая выгарадка, чыставая выгарадка. Камп’ютэрная графіка.

*Эмблема* свята (знак-сімвал, колеры, прынцыпы пабудовы і інш.)

*Каларыстыка* свята. Каларыстычная палітра як сродак выяўлення задумы свята. Колер у вобразна-мастацкім аблiччы свята, яго роля у каляндарна-абрадавых, грамадска-палітычных, прафесійных, спартыўных, дзіцячых і іншых святах. Каларыстычная карта свята.

**Практычныя заняткі.**

**Тэма 1.**
1. Архітэктура Беларусі.
2. Культавае дойлідства, знакавасць, сімволіка, стылістыка.
3.Старадаўнія паганскія сакральныя (культавыя) святыні Беларусі.

**Тэма 2.**
1.Вызначэнне паняццяў “сімвал”, “сімволіка”.

2. Выкарыстанне дзяржаўнай сімволікі ў святочнай культуры.

**Тэма 3**.
1. Месца свята.

**Тэма 4.**
1. Арганізацыя перад-, святочнай і постсвяточнай атмасферы свята мастацка-дэкаратыўнымі сродкамі.
2. Наладжанне сцэны і закуліснай прасторы.
3. Тэхнічнае аснашчэнне сцэны.

**Тэма 5.**
1. Аргкамітэт свята, яго склад і задачы структурных падраздзяленняў.
2. Паслядоўнасць і асноўныя этапы сцэнаграфічнага вырашэння свята.
3. Тэма, мэта, задачы свята. Месца і час свята.
4.Генеральны план тэрыторыі свята і памежных тэрыторый.
5. Эмблема свята.
6.Каларыстыка свята.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Самастойная работа**

| Назва тэм | Колькасць гадзін |
|---|---|
| 1. Тэматыка свята | 2 |
| 2. Месца і час свята | 2 |
| 3. Генеральны план свята | 4 |
| 4. Эмблема свята. | 2 |
| 5. Каларыстыка свята. | 4 |
| 6. Эскізная распрацоўка комплексаў свята | 6 |
| 7. Рэкламна-інфармацыйныя матэрыялы свята | 6 |
| **Усяго** | **26** |

**Пытанні да экзамену**

1. Матэрыяльная культура Беларусі ў кантэксце сучаснага свята
2. Асновы кампазіцыі.
3. Законы каларыстыкі.
4. Сцэнаграфія свята на адкрытай прасторы
5. Сцэнаграфія свята ў закрытым памяшканні .
6. Асаблівасці эпізодаў свята.
7. Жанравыя асаблівасці сцэнаграфіі свята.
8. Творчая група сцэнаграфіі свята і галоўныя прынцыпы яе работы.
9. Праект комплекснай сцэнаграфіі свята.
10. Стылістычнае адзінства.
11. Сімволіка і яе месца ў сцэнаграфіі свята.
12. Генеральны план свята.
13. Распрацоўка каларыстыкі свята.
14. Рэкламна-інфармацыйныя матэрыялы свята.
15. Распрацоўка тэматыкі свята.
16. Эмблема і каларыстыка свята.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Літаратура


1. Кацар М.С. Беларускі арнамент.Ткацтва.Вышыўка. Мн., 1996.
2. Миронович Л.Н  Учение в цвете. Мн., 1993.
3. Чарняк Ю.М. Рэжысура свят і відовішчаў. Мн., 2004.
4. Гуд П.А. Тэхналогія стварэння свята. Мн, 2004.
5. Шароев М.Г. Режиссура эстрадных и массовых представлений. М., 1986.
6. Афанасьев Д.В. Пространственное оформление спектакля, Л.,Искусство, 1990.
7. Базанов В.В. Техника и технология сцены. Л., Искусство, 1976.
8. Евдак О.П. Православные праздники; интеллектуальная игра.
9. Литвинов Г.В. Сценография праздника и театрализованного действа.
10. Лукашин С.Н. Технология праздника; рок-культура; авторская песня; сценарный банк театрализованных представлений.
11. Мордасов А.А. Театрализованный ритуал; музейная режиссура; спортивные праздники;
12. Скрипина Н.В. Прикладная хореография и педагогика; танец и праздник; пластические формы зрелища.
13. Шаронина М.Г. Теория и практика городских торжеств; студенческие конкурсно-игровые программы; режиссура церемониалов и обрядов, зримая песня.
14. Ягодинцева Н.А. Поэзия. Литература. Философия культуры.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ